■ Асабістае

МЫ ЗВАЛІ ЯЕ НАЙМУДРЭЙШАЙ

...Некалі — помніце? — мы стаялі ў даўжэзных чэргах. І зноў жа некалі, дастаяўшыся, набіралі ўсяго, як казаў гумарыст, «па два, па чатыры, па шэсць, па восем».
Тыя часы, дзякаваць Богу, мінулі, а вось звычка — засталася. Убачыўшы ў краме цікавую кніжку, я (калі пры грашах) бяру яе і сабе, і іншым...
Аднак пры гэтым, прычытаўшы, толькі аднойчы тэлефаную аўтарцы, каб выказаць захапленне.
Што яна? Ды, можна сказаць, нічога — перапыняе кароткім: «Вам спадабалася?.. То прыходзьце, я падпішу».
З таго першага прыходу (балазе ад рэдакцыі гэта блізка) прайшло амаль дзевяць гадоў, было мноства сустрэч... І сёння, у дзень нараджэння пісьменніцы Лідзіі Арабей (ёй споўнілася б 90!), трэба, лічу, хоць трохі расказаць пра яе...

Дзявочае прозвішча Лідзіі Львоўны — Качкоўская. Арабей яна стала ў гады вайны, калі з галоднага Мінска з'ехала ў Шчучын («Заходнікі лепей жылі»), калі там выйшла замуж, хоць кахання, казала, і не было («Проста пошук яго, адзінота...!»).

А ў хуткім часе мужа не стала — загінуў у фашысцкіх засценках.

І сама яна тройчы была пад дулам пісталета.

* * *

Са Шчучына ў разбураны Мінск Лідзія Львоўна вярнулася пасля яго вызвалення. Кандрат Крапіва (зямляк жанаты на стрыечнай сястры яе маці) дапамог дзяўчыне ўладкавацца на працу.

Так яна апынулася ў доме Міхася Лынькова, тагачаснага старшыні Саюза пісьменнікаў: парадкуе паперы, адказвае на тэлефонныя званкі...

Потым — і з той жа місіяй — трапляе ў дом Коласа.

На адным са здымкаў, што ўсё жыццё правісеў над ложкам Лідзіі Львоўны, яны з класікам удваіх. Міхась Лынькоў, расказвала, захапляўся фатаграфіяй і неяк прапанаваў Якубу Коласу: «А давайце я вас здыму!» — «Ну, тады з гэтай дзяўчынай», — пагадзіўся Колас.

А Лідзія Львоўна ўсё жыццё потым шкадавала, што ў кола гэтых людзей (была яшчэ праца ў «Вожыку» з Крапівой, Танкам, Брылём, Лужаніным...) трапіла вялікай дурніцай — нічога, можна сказаць, не разумеючы і нічога не запісваючы. Хіба...

Неяк да Лужаніна завітала цётка Уладзя, жонка Янкі Купалы, пахвалілася скарбам — двума брусочкамі мыла, адзін з якіх — убачыўшы вочы — падарыла будучай пісьменніцы.

...Усё жыццё тая помніла гэты падарунак і сама з ахвотай купляла розную драбязу, кшталту мыла, шампуняў, крэмаў.

* * *

Кнігу абразкоў «Пошукі ісціны», з якой пачалося наша знаёмства, падпісчыца «Звязды» Лідзія Львоўна (прабачце за таўталогію) падпісала Ніне Мацвееўне Бурко з Бярэзіншчыны, Соф'і Парфір'еўне Кусянковай і Антаніне Мікалаеўне Ерамеевай з Рагачоўшчыны, Лініі Радзівонаўне Зарэцкай з Пастаўшчыны, Іне Іосіфаўне Казлоўскай з Мінска...

«Калі пачынаецца вайна, першай ахвярай становіцца ісціна».

Водгукі былі самыя нечаканыя. Лілія Радзівонаўна, прынамсі, напісала Лідзіі Львоўне, што, захапіўшыся чытвом, забывалася карміць парсючка. А потым вышыла ёй падушачку.

Ніна Мацвееўна «моду ўзяла» прысылаць «гуманітарку» ў выглядзе розных вясковых прысмакаў. «З яе мядком і цвік праглынеш», — казала Лідзія Львоўна і ў халадзільніку заўсёды трымала кавалачак сала.

Антаніна Мікалаеўна (дарэчы, інвалід І групы) звязала пісьменніцы прыгожыя прыхваткі для гарачага. А кухонныя дошчачкі ад Соф'і Парфір'еўны гаспадыня павесіла на сцяну і, прызнаўшы іх за творы мастацтва, карыстацца не стала.

...Трэба сказаць, што гэтыя жанчыны прыйшлі ў жыццё пісьменніцы на гады — з лістамі, віншаваннямі, размовамі па тэлефоне і нават сустрэчамі.

* * *

...Ніна Мацвееўна запрашае нас з Лідзіяй Львоўнай у госці і сустракае нібы «ў кіне». Гэта значыць, што ад брамкі, насустрач нам, выходзяць трое: гаспадыня і меншая ўнучка з кветкамі, а большая — з хлебам-соллю.

Потым мы частуемся рознымі прысмакамі (у тым ліку з печы), спяваем пад гармонік (гаспадыня грае), разам з вясковымі кабетамі сядзім на лаўцы, ідзём да рэчкі. Лідзія Львоўна па дарозе разуваецца, заходзіць у ваду...

І потым яшчэ доўга ўспамінае, як мы ездзілі ў вёску і як яна — босая — хадзіла па траве.

* * *

Крыж адзіноты: другі муж Лідзіі Львоўны, вядомы мастак Яўген Ганкін, памёр амаль дваццаць гадоў таму, дзяцей у іх не было. «Як цяжка жыць, калі няма каго любіць, калі няма каго чакаць, калі няма каго абняць», — пісала пісьменніца ў адным з абразкоў.

Але ж пры гэтым катэгарычным «не трэба» адмятала ўсе спробы «падкінуць» ёй сабачку ці катка, узяць харошую кватарантку.

* * *

Пісьменніца вельмі не любіла (цяжка гаварыць пра яе ў прошлым часе) некага аб нечым прасіць, вельмі не хацела быць абавязанай. Адзінае — заўсёды пыталася: «А новую кніжку вы мне прынеслі?»

Будучая пісьменніца з маці Марыяй Антонаўнай МАХНАЧ. 1926 г.

Чытала шмат: Талстой, Пушкін, Быкаў (без купюр), Алексіевіч, за адну зіму — ці не ўвесь Колас, Алена Брава, Наталка Бабіна, Уладзімір Сцяпан, успаміны Карпюка, Тараса, Шаранговіча... І ўсё — пасля аперацыі на вачах, у акулярах, праз лупу, што, вядома ж, нязручна!

Прыношу планшэт. Паказваю, як на ім выбраць кнігу, як павялічыць шрыфт, як «перагортваць» старонкі.

Лідзія Львоўна трымае гэтую навамодную цацку ў руках, здзіўляецца і прамаўляе катэгарычнае «не», бо кніга ёсць кніга — навобмацак, на пах, на шоргат старонак...

Хто б спрачаўся...

* * *

Ёй жа пазваніў калега — папрасіў аб інтэрв'ю. Яна згадзілася, аднак напярэдадні той павыбачаўся, сказаў, што прыйсці не зможа: давайце, маўляў, у наступны чацвер. «Добра», — адказала Лідзія Львоўна, але і ў чацвер таму нешта не выпала...

Потым ён пазваніў зноў: маўляў, у мінулыя разы я не мог...

— А зараз, — Лідзія Львоўна была катэгарычнай, — не магу я... Выбачайце.

...Шкада, цікавай магла быць размова.

* * *

Завядзёнкі хадзіць у госці з пустымі рукамі ў нашай сям'і не было. Таму кожная сустрэча з пісьменніцай ператваралася ў маленькі «пір душ» (гэта калі блізкія душы збіраюцца разам і пачынаюць балявацъ). Зрэдку, па святах, мы дазвалялі сабе нават на кроплі нейкай смакаты, кшталту Арабейкі (гаспадыня настойвала ягады з цукрам, сок разводзіла гарэлкай), на стол выстаўлялі розныя прысмакі — я свае, Лідзія Львоўна — свае.

Мы хораша сядзелі! Як у «рэстаране»! Нават тры зорачкі яму «прысвоілі», бо гэта ў гасцініц зорачак пяць, а ў рэстаранаў — максімум тры.

* * *

Лідзія Львоўна любіла кветкі, кветкі любілі яе.

Вады ім гаспадыня не шкадавала: палівала ўсё досыць шчодра.

— Фіялкам, як людзям, лепш недапіць, чым перапіць, — заўважала я.

Лідзія Львоўна слухала, але рабіла па-свойму.

З мужам Яўгенам ГАНКІНЫМ.

Што здзіўляла, ніводзін вазон не крыўдаваў: усе яны хораша цвілі, клопатам гаспадыні — размнажаліся і разыходзіліся па руках.

* * *

У пісьменніцы была дача. Не ў памяці, калі яна яе купіла (можа, як палітончык, як сервіз, самавар, ляльку на чайнік, пральную машыну ды многае іншае, гадоў трыццаць, сорак ці пяцьдзясят таму), не ў памяці ў каго, але ж — да бабкі не хадзі — і прадавец, і пакупнік мелі розум! Дамок (такія нехта з расійскіх гумарыстаў назваў «зборнашчыліннымі») адным бокам туліўся да лесу. У ім быў ганак з лаўкай, дзе, відаць, так хораша сядзелася, прасторная веранда (справа — маленькая кухня, злева — канапка і круглы стол). А з яе — два на дзіва ўтульныя пакойчыкі: акенца, ложак, стол...

Мы ездзілі туды толькі раз. І ўжо тады, калі рашэнне аб продажы гэтага райскага куточка было прынята (працаваць там гаспадыня не магла, памочнікаў не мела)... Як яно далося Лідзіі Львоўне, уявіць няцяжка. Яна вельмі любіла зямлю, што трохі дзіўна, бо ў вёсцы, у слынным Нізку яна пражыла толькі два гады.

* * *

З паліцы на дачы мы забралі кнігі («А то новыя гаспадары яшчэ спаляць»), выкапалі некалькі шматгадовых кветак.

Лідзія Львоўна прыязджала потым на наша лецішча, радавалася, што ўсё расце. А мы ёй казалі, што кветнік носіць яе імя, што на доме, калі давядзём да ладу, з'явіцца дошка: маўляў, тут гасціла слынная беларуская пісьменніца...

«Самая вялікая і цяжкая навука жыцця — цярпенне».

Яна, вядома ж, разумела, што па сённяшнім часе глядзець на той дом турысты не паедуць, але сама размова была ёй прыемнай.

* * *

На снеданне ў пісьменніцы кава з бутэрбродамі. Цытую знаёмага «травазнаўцу»: «Нашча для страўніка кубачак распушчальнай кавы — тое ж што жменька пяску». Лідзія Львоўна смяецца: «А ў мяне нераспушчальная!»

Разам мы «перабіраем» усё — аўсянку, розныя тваражкі, мюслі, ёгурты і застаёмся пры сваім: на снеданне ў Лідзіі Львоўны кава і бутэрброды: «Усё астатняе мне нясмачна».

* * *

Вялікія малайцы ўздзенцы! Час ад часу Лідзія Львоўна паведамляе, што хтосьці адтуль званіў, што прыязджаў, што яе запрашалі прыехаць, што ездзіла, што па дарозе назад «хлопцы» (выдавец Віктар Хурсік, мастак Уладзімір Ткачоў, вялікі краязнаўца Уладзімір Кісялёў, журналіст Мікалай Кароль — светлай памяці!) заязджалі да яе.

...Часам яны заседжваліся (і, вядома ж, не за гарбатай), часам — спрачаліся ды стамлялі. Аднак... былі.

У апошнія гады гэты «хлапечы» гурт ад пісьменніцы неяк аддаліўся: хіба што, развітацца прыйшоў.

* * *

Лідзія Львоўна была добрай гаспадыняй. Да апошняга сама мыла і прасавала (нават пасцельную бялізну, чаго многія ўжо не робяць), толькі напрыканцы — стала дазваляць пачысціць вокны і прыбраць у кватэры (гэта рабіла спадчынніца, зводная сястра, двойчы на месяц — 4 і 20 числа), умела шыць, па маладосці — вышывала крыжыкам (на кухні вісела карціна), умела гатаваць, але займацца гэтым не любіла.

Валянціна ДОЎНАР.
dounar@zviazda.by

■ Будзе свята!

КІРМАШЫ ЗАКЛІКАЮЦЬ, НАСТРОЙ СТВАРАЮЦЬ

Ва ўсіх раёнах сталіцы 3 ліпеня пройдуць кірмашы, пра што паведамілі ў галоўным упраўленні спажывецкага рынку Мінгарвыканкама.

У Дзень Незалежнасці маштабныя народныя гулянні пройдуць на пляцоўцы каля Палаца спорту. Кірмаш будзе працаваць тут 3 ліпеня з 10 да 0.30, а 4 ліпеня — з 10 да 23 гадзін. Кірмашы пройдуць і ва ўсіх адміністрацыйных раёнах Мінска. Так, 3 ліпеня гулянні адбудуцца ў парку імя 50-годдзя Вялікага Кастрычніка, Лошыцкім парку, у гарналыжным цэнтры «Сонечная даліна», парку імя М. Горкага, на пляцоўцы па вуліцы Сталетава, у парку імя Чалюскінцаў, імя Дружбы народаў, імя 60-годдзя Кастрычніка. 3-4 ліпеня кірмашы адбудуцца ў парках імя Паўлава і Перамогі, з 3 па 6 ліпеня — у парку імя 900-годдзя Мінска, 4 ліпеня — каля цэнтра дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі «Ветразь», на пляцоўцы каля Камароўскага рынку, 5 ліпеня — у парку Цівалі. 6 ліпеня ў парку імя Я. Купалы з 12 да 22 гадзін будзе праходзіць фестываль «Купальскі лён» з рэалізацыяй тавараў канцэрна «Беллегпрам». Тут жа прапануюць набыць харчовыя тавары і прадукцыю грамадскага харчавання.

Сяргей РАСОЛЬКА.
rs@zviazda.by

■

АНГЛАМОЎНАЯ АСПІРАНТУРА ЗАПРАШАЕ...

Першая абарона магістарскіх дысертацый на англійскай мове адбылася на факультэце міжнародных адносін БДУ. Аўтары навуковых прац — грамадзяне Германіі, Кітая, Ірака, Лівіі і Казахстана. На працягу двух гадоў яны навучаліся ў англамоўнай магістратуры па спецыяльнасці «гісторыя міжнародных адносін і знешняй палітыкі».

Тэматыка дысертацый ахоплівала шэраг актуальных праблем сучасных міжнародных адносін і знешняй палітыкі розных дзяржаў. У прыватнасці, магістранты даследавалі ўплыў падзей «Арабскай вясны» на міжнародныя адносіны на Блізкім Усходзе і ў Паўночнай Афрыцы, перспектывы расійска-кітайскага збліжэння, міжнароднае супрацоўніцтва ў забеспячэнні бяспекі ядзерных матэрыялаў і інш.

Факультэт міжнародных адносін БДУ плануе ў найбліжэйшы час пашырыць спіс спецыяльнасцяў англамоўнай магістратуры і распрацаваць шэраг новых магістарскіх праграм для беларускіх і замежных студэнтаў.

Надзея НІКАЛАЕВА.
nikalaeva@zviazda.by

Результаты рекламной игры

IdeaBank Отличная идея!

«Отличная идея – выиграть!»

Организатором Рекламной игры является Закрытое акционерное общество «Идея Банк» (далее – организатор), зарегистрированное 24.04.2004 г. в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 807000122. Лицензия на осуществление банковской деятельности №25 от 03.06.2013 г. выдана Национальным банком Республики Беларусь. Местонахождение Заинтересованного лица: 220034, г. Минск, ул. З. Бядули, 11. УНП 80700012.

Рекламная игра носит название «Отличная идея – выиграть!» (далее – Игра) и проводится с 12 мая 2015 года по 29 июня 2015 года включительно (включая сроки выдачи призов и опубликования результатов проведения рекламной игры). Свидетельство о регистрации рекламной игры №2546 от 6.05.2015 г. выдано Министерством торговли Республики Беларусь.

Всего к участию в игре было допущено 12 417 участников, полностью соответствующих требованиям Правил Рекламной игры. Призовой фонд разыгран не полностью. В соответствии с Правилами Игры победителями стали 5 участников:

Победитель	Фамилия, инициалы победителя	Выигрыш
Победитель №1	Саринова Людмила Борисовна	446 985 (четыреста сорок шесть тысяч девятьсот восемьдесят пять) белорусских рублей
Победитель №2	Козловский Евгений Геннадьевич	24 490 008 (двадцать четыре миллиона четыреста девяносто тысяч восемь) белорусских рублей
Победитель №3	Скрипко Ольга Владимировна	3 181 840 (три миллиона сто восемьдесят одна тысяча восемьсот сорок) белорусских рублей
Победитель №4	Гуминский Андрей Александрович	10 190 897 (десять миллионов сто девяносто тысяч восемьсот девяносто семь) белорусских рублей
Победитель №5	Акульская Елена Валерьяновна	3 535 900 (три миллиона пятьсот тридцать пять тысяч девятьсот) белорусских рублей

Победители могут получить приз по адресу: г. Минск, З. Бядули, 11 в период с 17 по 29 июня 2015 года включительно.

Члены комиссии подтвердили, что розыгрыш проводился с соблюдением всех юридических норм и правил игры. Нарушений не было выявлено, жалоб организатору и комиссии не поступало.

Правила проведения рекламной игры, а так же ее результаты, были опубликованы в газете «Звязда» № 87 от 12.05.2015 и № 121 от 27.06.2015 соответственно.

Паритетбанк
www.paritetbank.by

Открытое акционерное общество «Паритетбанк»,
(Республика Беларусь, 220002, г. Минск, ул. Киселёва, 61а)
сообщает, что 8 июля 2015 года в соответствии с решением Наблюдательного совета ОАО «Паритетбанк» от 26 июня 2015 года, протокол № 19,
ПРОВОДИТСЯ ВНЕОЧЕРЕДНОЕ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ В ЗАОЧНОЙ ФОРМЕ С ПОВЕСТКОЙ ДНЯ:

1. О внесении изменений и дополнений в Устав ОАО «Паритетбанк».
2. Об утверждении изменений в Положение о Наблюдательном совете ОАО «Паритетбанк».
3. О признании утратившим силу Положения о порядке использования прибыли ОАО «Паритетбанк».
4. О рекомендуемом размере дивидендов по акциям ОАО «Паритетбанк».

Собрание проводится по адресу: г. Минск, ул. Киселёва, 61а, комн. 205.

Список лиц, имеющих право на участие во внеочередном Общем собрании акционеров, составляется на основании реестра владельцев ценных бумаг, сформированного по состоянию на 29 июня 2015 года.

Регистрация лиц, имеющих право на участие во внеочередном Общем собрании акционеров, будет проводиться при получении бюллетеней при предъявлении документов, удостоверяющих личность (подтверждающих их полномочия).

Получить бюллетени для заочного голосования и ознакомиться с материалами к собранию участники собрания могут по адресу: г. Минск, ул. Киселёва, 61а, комн. 205 – 30 июня 2015 года и 1 июля 2015 года с 9.00 до 13.00 по месту проведения внеочередного Общего собрания акционеров.

Заполненные бюллетени для заочного голосования должны быть возвращены не позднее 2 июля 2015 года по месту проведения внеочередного Общего собрания акционеров, дата подсчета голосов – 6 июля 2015 года.

Принявшими участие во внеочередном Общем собрании акционеров считаются лица, заполненные бюллетени которых получены ОАО «Паритетбанк» в указанном порядке, которые включаются в одноименный список.

Телефон для справок: 288 63 31.

Наблюдательный совет ОАО «Паритетбанк».

Лицензия на осуществление банковской деятельности Национального банка Республики Беларусь от 08.05.2013 г. № 5. УНП 100233809.

ИЗВЕЩЕНИЕ
о проведении 28 июля 2015 года открытых аукционных торгов с условиями по продаже единым предметом торгов имущества
детского оздоровительного лагеря «Юный Коммунар»

Сведения о предмете торгов (продаваемом имуществе)
«Спальный корпус» с инвентарным номером 600/С-98138 общей площадью 536,7 кв. м; «Здание дома отдыха (корпус)» с инвентарным номером 600/С-100723 общей площадью 182,0 кв. м; «Здание административного корпуса» с инвентарным номером 600/С-100602 общей площадью 100,3 кв. м; «Здание склада спортинвентаря» с инвентарным номером 600/С-100626 общей площадью 53,9 кв. м; «Здание медпункта» с инвентарным номером 600/С-100718 общей площадью 80,3 кв. м; «Здание котельной, прачечной» с инвентарным номером 600/С-100720 общей площадью 250,3 кв. м; «Здание дома отдыха» с инвентарным номером 600/С-100722 общей площадью 103,8 кв. м; «Здание подстанции» с инвентарным номером 600/С-100619 общей площадью 19 кв. м; «Здание склада» с инвентарным номером 600/С-100616 общей площадью 35,6 кв. м; «Здание спального корпуса» с инвентарным номером 600/С-100613 общей площадью 177,7 кв. м; «Здание спального корпуса» с инвентарным номером 600/С-100609 общей площадью 174,4 кв. м; «Здание спального корпуса» с инвентарным номером 600/С-100612 общей площадью 175,8 кв. м; «Здание насосной станции» с инвентарным номером 600/С-100621 общей площадью 13,2 кв. м; «Здание спального корпуса» с инвентарным номером 600/С-100624 общей площадью 174,8 кв. м; «Здание картофелечистки» с инвентарным номером 600/С-100726 общей площадью 29,7 кв. м; «Здание овощехранилища» с инвентарным номером 600/С-100729 общей площадью 125,8 кв. м; «Клуб» с инвентарным номером 600/С-149082 общей площадью 260,3 кв. м; «Спальный корпус» с инвентарным номером 600/С-149077 общей площадью 278,4 кв. м; «Дом сторожа» с инвентарным номером 600/С-149083 общей площадью 34,5 кв. м.
Сведения о земельном участке: площадь – 6,3240 га, кадастровый номер 623681700001000204, целевое назначение – Земельный участок для обслуживания зданий и сооружений оздоровительного лагеря «Юный Коммунар»
Местонахождение: Минская область, Минский район, район деревни Крыжовка
Продавец имущества: СОАО «КОММУНАРКА», Республика Беларусь, 220033, г. Минск, ул. Аранская, 18
Организатор торгов: УП «Минский городской центр недвижимости», г. Минск, ул. К. Маркса, 39, к. 10
Начальная цена предмета торгов (с учетом НДС): 6 278 397 600 белорусских рублей
Сумма задатка: 600 000 000 белорусских рублей
Условия торгов (условия продажи): 1. Победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере одного процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов; 2. Сохранение функционального назначения продаваемого имущества – оздоровительно-туристический комплекс.

Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего СОАО «КОММУНАРКА», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, внесшие задаток, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется на расчетный счет УП «Минский городской центр недвижимости» № 3012104971019 в региональной дирекции №700 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, код 153001369, УНП 190398583 в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае, если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) по согласованию с продавцом в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежных документов о перечислении суммы вознаграждения за организацию и проведение торгов и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения торгов.

Торги проводятся **28 июля 2015 года в 14.30** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются **с 29.06.2015 по 24.07.2015 включительно** в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

По вопросу ознакомления с продаваемым имуществом следует обращаться по телефону: (029)13-11-302 (СОАО «КОММУНАРКА»).

Телефоны для справок:
(017)327-48-36 (УП «Минский городской центр недвижимости»);
(029)13-11-302 (СОАО «КОММУНАРКА»).

УЗДЕНСКИЙ РАЙОННЫЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ
4 августа 2015 года по адресу: г. Узда, ул. Советская, 22, кабинет 418 (4-й этаж) в 10.00 проводит открытый аукцион по продаже земельных участков в частную собственность гражданам для коллективного садоводства в садоводческом товариществе «Сымончицы-2»

НА АУКЦИОННЫЕ ТОРГИ ВЫСТАВЛЯЮТСЯ УЧАСТКИ:

№ лота	Продавец	Местонахождение участка	S (га)	Кадастровый номер	Нач. цена (бел. руб.)	Расх. по подгот-ке (кроме расх. на публ-цию извещ.)
Лот №1	Узденский райисполком	Узденский р-н, СТ «Сымончицы-2», уч. №59	0,0610	625684200003000059	5 500 000	450 000
Лот №2	Узденский райисполком	Узденский р-н, СТ «Сымончицы-2», уч. №84	0,0599	625684200003000082	4 500 000	8 680 210
Лот №3	Узденский райисполком	Узденский р-н, СТ «Сымончицы-2», уч. №85	0,0660	625684200003000035	4 500 000	-
Лот №4	Узденский райисполком	Узденский р-н, СТ «Сымончицы-2», уч. №97	0,0611	625684200003000083	5 500 000	8 680 210

Целевое назначение участков – для ведения коллективного садоводства в садоводческом товариществе «Сымончицы-2».

Задаток в размере 10 процентов от начальной цены земельного участка перечисляется путем безналичных расчетов платежным поручением (квитанцией) на счет № 3600631002518 Главного управления Министерства финансов Республики Беларусь по Минской области в ЦБУ №625 филиала №500 Минского управления ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Узда, МФО 153001601, УНП 600537220, код платежа – 04901.

Граждане, желающие участвовать в аукционе в отношении нескольких земельных участков, вносят задатки в размере, установленном для каждого из этих земельных участков.

Заявления на участие в аукционе с необходимыми документами принимаются по адресу: **г. Узда, ул. Советская, 22, кабинет 206, с 8⁰⁰ до 17⁰⁰ по рабочим дням по 29 июля 2015 года включительно.**

Участники аукциона должны представить следующие документы:

• заявление на участие в аукционе с указанием кадастровых номеров и адресов земельных участков;

• документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков) на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении, с отметкой банка;

• копию документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования (ксерокопия паспорта);

• представителем гражданина – нотариально заверенную доверенность.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан представляют документ, удостоверяющий личность.

Заключительная регистрация – с 8³⁰ до 9⁴⁵ в день проведения аукциона.

Аукцион состоится по каждому лоту при наличии не менее двух участников.

Оплата победителем за предмет аукциона производится разовым платежом путем безналичных расчетов.

Победителю за предмет аукциона необходимо произвести возмещение фактических расходов по организации и проведению аукциона и подготовке документации для его проведения.

Участники аукциона предварительно могут ознакомиться с земельными участками, которые предлагаются для продажи на аукционе, путем выезда к месту нахождения этих участков.

НА АУКЦИОННЫЕ ТОРГИ НА ПРАВО ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРА АРЕНДЫ ПОВТОРНО ВЫСТАВЛЯЮТСЯ УЧАСТКИ:

№ лота	Арендодатель	Местонахождение участка	S (га)	Кадастровый номер	Начальная цена (бел. руб.)	Расх. по подгот-ке (кроме расх. на публ-цию извещ.)
Лот №5	Узденский райисполком	г. Узда, ул. Новицкого (№73 по ПДП)	0,1985	625650100001000581	125 617 152	11 982 771
Лот №6	Узденский райисполком	г. Узда, ул. Новицкого (№68 по ПДП)	0,1996	625650100001000582	126 313 267	11 661 815

Целевое назначение участков – для строительства и обслуживания многоквартирного жилого дома (для размещения объектов многоквартирной жилой застройки). Инженерно-техническое обеспечение земельного участка отсутствует. Срок аренды участка – 99 лет.

Победитель аукциона либо единственный участник несостоявшегося аукциона возмещает расходы, связанные с проведением аукциона и формированием земельного участка, в том числе с государственной регистрацией в отношении создания земельного участка, и публикацией объявлений об аукционе в средствах массовой информации. Оплата в размере цены продажи объекта (за вычетом задатка) производится в течение 10-ти рабочих дней со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона.

Заявления на участие в аукционе с необходимыми документами принимаются по адресу: **г.Узда, ул. Советская, 22, кабинет 206, с 8⁰⁰ до 17⁰⁰ по рабочим дням по 29 июля 2015 года включительно.**

Участники аукциона должны представить следующие документы:

• заявление на участие в аукционе с указанием кадастровых номеров и адресов земельных участков;

• документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков) на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении, с отметкой банка.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан, индивидуальных предпринимателей и юридических лиц представляют документ, удостоверяющий личность, а также копии документов о государственной регистрации ИП, юридического лица, копии учредительных документов, представителем или уполномоченным должностным лицом – нотариально удостоверенная доверенность (для уточнения правильности оформления необходимого пакета документов обращаться по телефону 8 (01718) 65338).

Задаток в размере 10 процентов от начальной цены земельного участка перечисляется путем безналичных расчетов платежным поручением (квитанцией) на счет 3600631002518 Главного управления Министерства финансов Республики Беларусь по Минской области в ЦБУ №625 филиала №500 Минского управления ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Узда, МФО 153001601, УНП 600537220, код платежа на право заключения договора аренды земельного участка – 04002. Граждане, индивидуальные предприниматели и юридические лица, желающие участвовать в аукционе в отношении нескольких земельных участков, вносят задатки в размере, установленном для каждого из этих земельных участков.

Аукцион состоится по каждому лоту при наличии не менее двух участников.

Участники аукциона предварительно могут ознакомиться с земельными участками, которые предлагаются для аренды на аукционе путем выезда к месту нахождения этих участков.

Более подробная информация об аукционах, условиях участия размещена на официальном сайте Узденского районного исполнительного комитета: **www.uzda.minsk-region.by**, либо по телефонам **(801718) 65404, 54705, 65338.**